КОМСАМОЛЬСКАЕ ЖЫЦЦЁ

# Даражы комсамольскім білетам

На ўсё жыццё застаецца ў памяці кожнага комсамольца ўрачысты і шчаслівы момант, калі яму ўручаюць маленькую кніжку з сілуэтам вялікага Леніна на вокладцы—комсамольскі білет, пасведчанне членства ў радах гераічнага, адзначанага чатырма ордэнамі комсамола.

З комсамольскім білетам ля сэрца ішлі ў бой і перамагалі героі грамадзянскай і Вялікай Айчыннай вайны. З комсамольскім білетам ля сэрца наша слаўная совецкая моладзь паказвае ўзоры працоўнага гераізма ля станкоў і на калгасных палях, упарта авалодвае ведамі ў школах, тэхнікумах і ВНУ краіны.

Кожнаму комсамольцу бязмерна дораг і свят комсамольскі білет. У час Вялікай Айчыннай вайны фашысцкія захопнікі жорстка каралі совецкіх юнакоў і дзяўчат за прыналежнасць да комсамола. Але героі-комсамольцы ніколі не разлучаліся з комсамольскім білетам, зберагалі і захоўвалі яго, як святыню. У гэтым яны чэрпалі новыя сілы ў барацьбе з ворагамі.

У адносінах да захоўвання комсамольскага білета нецярпімы ніякая халатнасць і неахайнасць, разявацтва і нядбайнасць. На жаль, сярод комсамольцаў нашага універсітэта ёсць яшчэ такія таварышы, якія абыякава адносяцца да захавання комсамольскага білета, носяць яго ў сумачках, партфелях ці ў кішэні разам з грашыма. У гэтым годзе многія комсамольцы атрымалі спагнанні за згубу білетаў. Так, студэнтка II курса фізіка-матэматычнага факультэта Н. Сакалова і студэнтка III курса аддзялення журналістыкі І. Алфімава насілі білеты ў сумачках, якія ў іх укралі разам з білетамі.

Згубіла свой комсамольскі білет студэнтка V курса фізіка-матэматычнага факультэта С. Ігнаценка. Яна з недаравальнай халатнасцю аднеслася да захавання комсамольскага дакумента.

Кожны комсамолец заўсёды павінен мець пры сабе білет. Але гэтае палажэнне ігнаруецца некаторымі таварышамі. У іх увайшла ў быт заганная практыка пакідаць білеты дома. Да нашага сораму, асобныя комсамольцы нават на комсамольскія сходы прыходзяць без білетаў. Так, 25 сакавіка на сходзе I курса аддзялення рускай мовы і літаратуры з 35 комсамольцаў 13 не мелі пры сабе комсамольскіх білетаў. Студэнт I курса геафака В. Раманоўскі прышоў на паседжанне камітэта ЛКСМБ без білета, таму што пакінуў яго дома, у вёсцы. Гэты факт гаворыць аб тым, што Раманоўскі і падобныя яму таварышы не даражаць самым пачэсным для маладога совецкага чалавека—прыналежнасцю да комсамола.

У сувязі з гэтым важная задача ўскладаецца на комсамольскі актыў. Неабходна пастаянна кантраляваць наяўнасць і стан у комсамольцаў комсамольскіх білетаў, быць патрабавальнымі да неахайных і нядбайных таварышаў, выхоўваць беражлівыя адносіны да прадмета гонару кожнага комсамольца — комсамольскага білета.

**Л. БАГДАНАВА,**
**член камітэта ЛКСМБ універсітэта.**

ПА СЛЯДАХ НАШЫХ ВЫСТУПЛЕННЯЎ

## „ЦІ ТАКОЙ ПАВІННА БЫЦЬ ФАКУЛЬТЭЦКАЯ ГАЗЕТА?"

Гэтае пытанне ўзнімала наша газета 2 сакавіка 1954 года ў артыкуле, дзе крытыкавалася дрэнная работа рэдкалегіі насценгазеты «Студент истфака».

Факты, пададзеныя ў артыкуле, абмяркоўваліся ў камітэце ЛКСМБ універсітэта і ў комсамольскім бюро гістфака. Прызнана мэтазгодным змяніць састаў рэдкалегіі. Новая рэдкалегія (рэдактар Ф. Каштанаў) ужо выпусціла чарговы нумар насценгазеты, глыбокі па зместу і яркі па афармленню.

лепшым відам дапамогі калектыва кафедры кожнаму выкладчыку.

З 1949 па 1953 год супрацоўнікі кафедры ў розных навуковых выданнях надрукавалі 17 артыкулаў, выдалі тры навукова-папулярныя брашуры. Каля 40 артыкулаў было змешчана ў рэспубліканскіх газетах і часопісах. У друку знаходзяцца 5 навуковых работ, падрыхтавана да друку 9 метадычных артыкулаў.

Указанне Міністэрства Вышэйшай адукацыі аб тым, што выпускнікі фізіка-матэматычнага факультэта будуць у асноўным накіроўвацца на работу ў сярэднія школы, патрабуе значнага ўзмацнення метадычнай работы на кафедры і далейшага расшырэння сувязі кафедры са школай. Побач з вытворчай практыкай для студэнтаў фізмата зноў узнаўляецца педагагічная практыка. Метадычнае кіраўніцтва ў студэнтаў фізічнага аддзялення таксама павінна ўвайсці ў круг абавязкаў кафедры агульнай фізікі. Гэта патрабуе стварэння пры кафедры ўзорнага кабінета з поўным наборам наглядных дапаможнікаў па курсу фізікі сярэдняй школы. Наяўнасць такога кабінета дазволіць студэнтам-фізікам лепш вывучыць тэхніку школьнага эксперымента і будзе садзейнічаць высокай якасці падрыхтоўкі спецыялістаў для сярэдняй школы.

На кафедры нехапае навукова-дапаможных работнікаў, што выклікае перагрузку лабарантаў і не дае ім магчымасці працаваць над далейшым тэхнічным аснашчэннем лабараторый. Гэтую акалічнасць неабходна ўлічыць вучэбнай частцы універсітэта пры зацвярджэнні штатаў на будучы навучальны год, таму што ў сувязі са значным павелічэннем прыёму на прыродазнаўчыя факультэты яшчэ больш павялічыцца загрузка лабарантаў. Узнікае неабходнасць далейшага павелічэння плошчы пад лабараторыі фізічнага практыкума, таму што гэтыя лабараторыі ўжо з цяжкасцю задавальняюць патрабаванні вучэбнага працэсу.

Тэрмінова неабходна таксама правесці пераабсталяванне і даабсталяванне электраправодкі ў многіх лабараторыях.

Калектыў кафедры агульнай фізікі мае ўсе магчымасці для таго, каб паспяхова справіцца з пастаўленымі перад ёй задачамі.

**І. Г. НЕКРАШЭВІЧ,**
**заг. кафедры агульнай фізікі.**

НАШЫ МАЛАДЫЯ ПАЭТЫ

## *НІЛ ГІЛЕВІЧ*

*У апошнія гады на старонках часопісаў і рэспубліканскіх газет часта можна ўбачыць вершы студэнта III курса філалагічнага факультэта Ніла Гілевіча. Малады паэт паступіў у БДУ імя В. І. Леніна пасля заканчэння Мінскага педагагічнага вучылішча імя Крупскай. Добры і ўдумлівы таварыш, які чула адносіцца да сяброў, Ніл Гілевіч з першага-ж курса ўключаецца ў грамадскую дзейнасць факультэта, настойліва і нястомна вучыцца. Разам з тым вялікую ўвагу ўдзяляе чытанню мастацкай літаратуры, павышэнню паэтычнага майстэрства. Вершы Ніла Гілевіча прасякнуты лірычнай цеплынёй і шчырасцю.*



*19 сакавіка гэтага года на паседжанні праўлення Саюза Совецкіх Пісьменнікаў БССР Ніл Гілевіч быў прыняты ў кандыдаты ССП БССР. Выступаўшыя з разглядам вершаў Ніла Гілевіча адзначылі ў іх добрую паэтычную тэхніку, свежыя вобразы, добрае веданне мовы паэтам. Ніжэй мы змяшчаем новыя вершы Ніла Гілевіча.*

### ПЕРШАКУРСНІЦА

Гаварыла ёй маці, складаючы рэчы:
—Ну, дачушка, глядзі-ж ты сябе ўжо хаця...
І над кніжкай, Аленка, не сохні штовечар:
Каб усе прачытаць іх—не хопіць жыцця...

Ды яшчэ, як заяву прывозіла ўлетку,
Заглянула Аленка у бібліятэку,
Дзе цудоўныя скарбы на полках стаяць.
У дзяўчыны ад шчасця разбегліся вочы:
„Колькі тысяч тамоў! і бяры—які хочаш!
Вось дзе спраўдзіцца мара мая!"
Можа быць, прачытаўшы удумна паштоўку,
Будзе крыўдзіцца маці ў далёкім пасёлку,
Што Аленка не ўважыла слоў яе тых.
Толькі як тут дзяўчыне наказу трымацца,
Калі гэтулькі спраў, калі гэтулькі працы,
Калі гэтулькі сіл у грудзях маладых!
Нездарма яна ў дзённік сабе запісала
На старонцы на першай радкі з „Капітала",
Што ў навуцы праезжага тракта няма,—
Ёсць сцяжынка—цяжкая, крутая сцяжынка:
Трэба крочыць упарта, ісці безупынку...
Перамога насустрач не ходзіць сама.
Хай сяброўкі-таварышкі дзівяцца часта,
Хай старожка-бабуля пытаецца часам:
Што так позна кладзешся, што так рана ўстаеш?—
Ёсць высокая, ясная мэта ў дзяўчыны,
А да мэты іначай ісці немагчыма,
Як штодзень, штогадзіну—на новы рубеж.

І калі праз гады, пасталеўшай і рослай,
Прыдзе ў школу дзяўчына у родную вёску,

І з павагай аб ёй адзавецца калгас
За глыбокія веды, за шчырую працу,—
Пэўна, пэўна прабачыць шчаслівая маці,
Што не выканан быў яе строгі наказ.

### ВЯСЕЛЛЕ

Больш нікому не горка,
І госці ідуць
Ад багатых сталоў да парога,
І на вуліцы хлопцы ўжо змову вядуць,
Як-бы выкуп сарваць з маладога.

Што той выкуп!
Мяне ён не так абабраў,
І цяпер ля нявесцінай хаты
Намагаюся ўвесь, каб не выдаць сябрам
Неўтаймованы боль той упарты.

Цэлы год, затаіўшы ў грудзях пачуццё,
Я сачыў за кукольнай касою,
Любаваўся употай,—і славіў жыццё,
Што надзелена гэткай красою,

А цяпер маю мару звязе трактарыст,
Павязе маю песню далёка.
Што-ж ты, сэрца?—
Цябе я не змог пакарыць—
Што-ж ты так пакарылася лёгка?

Трактарысту зайздрошчу—
Не стану хлусіць.
А за лёс маладой не крыўдую.
Знаю: будзе да смерці ён жонку любіць,
Моцна так, як цяпер маладую.

...Спачуваючы ўпотайкі гору майму,
Не чакалі сягоння кабеты,
Што і я за сталом шчыра тост узніму
За шчаслівыя доўгія леты.

ТРЫБУНА ВЫДАТНІКА

## Галоўнае—сістэматычнасць у вучобе

Самае галоўнае, што дапамагае мне ў паспяховай вучобе—гэта сістэматычнасць у рабоце. Рэгулярныя заняткі на працягу ўсяго навучальнага года непазбежна прыводзяць да глыбокага засваення вывучаемага матэрыялу, дазваляюць пазбегнуць штурмаўшчыны ў перыяд падрыхтоўкі да экзаменаў. Рыхтуючыся да семінарскіх заняткаў, я імкнуся як мага больш прачытаць матэрыялу па данай тэме, а затым рэдагую гэты матэрыял, раблю выпіскі з твораў класікаў марксізма-ленінізма. Гэта ў паследуючым, у дні непасрэднай падрыхтоўкі да экзаменаў, значна аблягчае паўтарэнне.

Работа ў навукова-даследчым гуртку дае мне магчымасць больш глыбока асэнсоўваць многія пытанні вучэбнай праграмы. Тэматыка гуртка цікавая, у цэнтры ўвагі яго знаходзяцца праблемы сучаснага прыродазнаўства, галоўным чынам праблемы, якія звязаны з фізіялагічным вучэннем акадэміка І. П. Паўлава. Я ў сучасны момант працую над дакладам «Праблема ўзаемаадносін аб'ектыўнага і суб'ектыўнага ў святле вучэння І. П. Паўлава». У працэсе падрыхтоўкі даклада шырока выкарыстоўваю творы класікаў марксізма-ленінізма, у якіх разглядаецца цікавячая мяне праблема. Прачытаў амаль усе творы І. П. Паўлава, зрабіў больш ста выпісак з іх. Пазнаёміўся з успамінамі жонкі вялікага фізіёлага С. П. Паўлавай і бліжэйшых яго вучняў і супрацоўнікаў, чытаю мастацкую літаратуру аб І. П. Паўлаве і яго вучнях. Акрамя таго, пры разглядванні гэтай праблемы думаю выкарыстаць работы вучняў Паўлава—Б. М. Быкава, А. Г. Іванова-Смаленскага, Н. І. Краснагорскага, Ю. П. Фралова і інш, а таксама шматлікія кнігі і артыкулы па пытаннях фізіялогіі, псіхалогіі, філасофіі, неўрапаталогіі, псіхіятрыі. У працэсе падрыхтоўкі даклада я атрымоўваю каштоўныя парады ад П. Ф. Пратасені, які дапамагае мне разбірацца ў самых складаных дыскусійных пытаннях.

**Е. БАБОСАЎ,**
**студэнт IV курса аддз. філасофіі.**

